Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (142), 2024

УДК 930 EDN: FCGBGX

# Праблема «язычніцкага монатэізму» Рымскай імперыі эпохі прынцыпату ў сучаснай заходняй гістарыяграфіі

С.М. Смірноў

У дадзеным артыкуле разглядаюцца асноўныя погляды заходніх даследчыкаў аб праблеме «язычніцкага монатэізму» ў рэлігійнай гісторыі Рымскай імперыі. Выяўляецца сутнасць дадзенай праблемы і яе сувязь з сучаснымі метадалагічнымі падыходамі даследаванняў антычнай рэлігійнасці. Сучасная гістарычная навука імкнецца выпрацаваць комплексны і сістэмны падыход да вывучэння антычнай рэлігійнай думкі і рытуальнай практыкі.
**Ключавыя словы:** Рымская імперыя, заходняя гістарыяграфія, «язычніцкі монатэізм», політэізм, рэлігійны сінкрэтызм, антычная рэлігія.

This article discusses the main views of Western scholars on the problem of «pagan monotheism» in the history of religion of the Roman Empire. It highlights the essence of this problem and its relationship to methodological approaches to the study of ancient religiosity. Modern historical science seeks to develop a comprehensive and systematic approach to the study of religious thought and ritual practice of antiquity.
**Keywords:** The Roman Empire, Western historiography, «pagan monotheism», polytheism, religious syncretism, ancient religion.

**Уводзіны.** Аб'ектыўная карціна рэлігійнай гісторыі антычнага свету не можа скласціся без агульнага разгляду праблем рэлігійнага сінкрэтызму і монатэістычных тэндэнцый у духоўнай культуры Рымскай імперыі I–III стст. н. э. Зварот да дадзенай праблематыкі дагэтуль захоўвае сваю актуальнасць з-за культурнай і рэлігійнай спадчыны антычнага свету ў сучасным свеце, асабліва на фоне дыялогу культур і рэлігій у сучасным свеце. Але ўдакладненне агульнай карціны рэлігійнай гісторыі Рымскай імперыі не можа абысціся без абмеркавання пытанняў гістарыяграфіі і метадалогіі даследавання рэлігійнага жыцця антычнага свету. Агульны агляд асноўных думак і метадалагічных падыходаў сучаснай заходняй гістарычнай і рэлігіязнаўчай навукі да гісторыі рэлігійнага сінкрэтызму і «язычніцкага монатэізму» дазволіць паглыбіць тэарэтычныя асновы далейшых даследаванняў рэлігійнай гісторыі антычнасці.

Абмеркаванне праблемы рэлігійнага сінкрэтызму і «язычніцкага монатэізму» значна актывізавалася на рубяжы XX і XXI стст., што адбылося на аснове новых падыходаў гістарычнай навукі XX ст. да вывучэння гісторыі духоўнай культуры Рымскай імперыі. Сучасныя заходнія даследчыкі, творчасць якіх прыпадае на апошнюю трэць XX і першыя дзесяцігоддзі XXI ст., пачалі пераглядаць класічную мадэль рэлігійнай гісторыі старажытных цывілізацый. Дадзеная мадэль была сфармулявана ў працах гісторыкаў XIX – першай паловы XX стст., якія разглядалі духоўную культуру антычнага свету праз прызму адналінейнай эвалюцыі антычнай рэлігіі ад прымітыўнага політэізму да больш дасканалага монатэізму, ад рэлігіі без дакладных этычных нормаў да рэлігіі са строгімі нормамі этыкі. На іх думку, монатэістычныя тэндэнцыі ў рэлігійным жыцці Рымскай імперыі I–III стст. з'яўляліся вынікам уплыву ўсходніх містэрыяльных культаў, якія падрыхтавалі імперыю да прыняцця хрысціянства. Такім чынам, гэтыя даследчыкі значна перабольшвалі дадзеныя тэндэнцыі ў духоўнай культуры антычнасці. Напрыклад, для французскага гісторыка рэлігіі Эрнеста Рэнана монатэістычныя тэндэнцыі ў рэлігійным жыцці антычнага свету былі выкліканы тым, што політэістычная рэлігія не мела этычнага вымярэння і не адпавядала духоўным запытам насельніцтва Рымскай імперыі. Таму першыя стагоддзі існавання імперыі сталі перыядам актыўнага рэлігійнага пошуку, які праяўляўся ў росце папулярнасці ўсходніх культаў і звароце антычных філосафаў да рэлігійнай і этычнай праблематыкі. Але высокая этыка магла грунтавацца толькі на строгім монатэізме, які прапаноўваўся прыхільнікамі яўрэйскай рэлігіі і ранняга хрысціянства, што і абумовіла канчатковую перамогу гэтай маладой рэлігіі [1, с. 336–339]. Фадзей Зялінскі лічыў рэлігійную палітыку рымскіх імпера-

тараў Элагабала і Аўрэліяна яскравым прыкладам салярнага монатэізму ў рэлігійным жыцці Рымскай імперыі III ст. На яго думку, салярны монатэізм з'яўляўся вяршыняй развіцця рымскай рэлігіі [2, с. 104–117, 341–355]. Да падобных высноў аб салярным монатэізме ў Рымскай імперыі прыходзілі даследчыкі Франц Альтхайм [3, p. 433–465], [4, p. 62–68, 73–83 ] і Гастон Хальсберге [5, p. 79–84].

**Асноўная частка.** Да абмеркавання пытання «язычніцкага монатэізму» ў рэлігійнай гісторыі антычнасці звярталіся заходнія даследчыкі гісторыі антычнай літаратуры, спецыялісты ў галіне гісторыі антычнай філасофіі і гісторыкі рэлігійнага жыцця антычнай цывілізацыі. У дадзеным артыкуле сярод прадстаўнікоў класічнай філалогіі прыводзяцца думкі брытанскага філолага Марціна Л. Ўэста і іспанскага даследчыка Мігеля Эрэра дэ Хаўрэгі (Мадрыдскі ўніверсітэт), якія імкнуліся выявіць асаблівасці «монатэістычнага» дыскурсу ў літаратурнай спадчыне старажытнага свету. Да пытання язычніцкага монатэізму звярталіся даследчыкі гісторыі антычнай філасофіі: нямецкі філосаф Міхаэль Фрэдэ, ірландскі гісторык антычнага платанізму Дж. Дылан і грэчаскі даследчыкі інтэлектуальнай спадчыны антычнага неаплатанізму Нікетас Сініясаглу. У рамках інтэлектуальнай і культуральнай гісторыі над дадзеным пытаннем працуюць грэчаская даследчыца рэлігійнай і філасофскай літаратуры эпохі элінізму і Рымскай імперыі Палімнія Афанасіядзі (Афінскі ўніверсітэт) і бельгійскі гісторык антычнай культуры Петэр ван Нуфелен, навуковая дзейнасць якога праходзіць ва ўніверсітэце Гента. Пэўную ўвагу наяўнасці монатэістычных тэндэнцый ў рэлігійным жыцці антычнага свету надавалі амерыканскі гісторык Рамсі Макмален, брытанская даследчыца старажытнага Рыму Мэры Бірд і гісторык антычнай рэлігіі Сайман Прайс, грэчаскі гісторык эліністычнай культуры Ангелас Ханіёціс і французская даследчыца культурнага сінтэзу ва ўсходніх правінцыях Рымскай імперыі Ніколь Белайшэ.

Падчас абмеркавання праблемы «язычніцкага монатэізму» ў рэлігійнай гісторыі Рымскай імперыі заходнія даследчыкі звярнулі ўвагу не толькі на выяўленне монатэістычных тэндэнцый, але імкнуліся апісаць і высветліць сутнасць і асноўныя асаблівасці «язычніцкага монатэізму» і яго якаснае адрозненне ад монатэізму яўрэйскай рэлігіі і ранняга хрысціянства. Узнікла пытанне слушнасці супрацьпастаўлення тэрмінаў язычніцтва і монатэізм, іх зручнасці для крытычнага даследавання рэлігійнай гісторыі антычнасці. Традыцыйна склалася ўяўленне, што монатэізм – гэта вера і шанаванне аднаго бога, а язычніцтва – гэта традыцыйны політэізм народаў старажытнага свету. На думку брытанскага даследчыка Марціна Л. Ўэста, такі падыход замінае высвятленню асноўных асаблівасцей рэлігійнай свядомасці старажытных цывілізацыі. Безумоўна, што антычная рэлігія насіла політэістычны характар, але якаснага і рэзкага скачка ад політэізму да монатэізму не адбылося ў гісторыі старажытнага свету. Даследчык настойваў на паступовай трансфармацыі старажытнай рэлігіі, якая заключалася ў росце ролі і значэння таго ці іншага бога ў пантэонах старажытных цывілізацыі. Падмацоўвалі гэтую трансфармацыю тэалагічныя пошукі інтэлектуальнай эліты антычнага свету [6]. Да праблемы язычніцкага монатэізму і інтэлектуальнай гісторыі антычнасці звяртаўся нямецкі даследчык Міхаэль Фрэдэ, які бачыў адрозненне паміж політэізмам і монатэізмам у якасным характары багаў у рэлігійных уяўленнях старажытных грэкаў і рымлян. Якаснае адрозненне паміж політэізмам і монатэізмам заключаецца ў пытанні прыроды багоў, іх суадносін з існуючым светам. У антычным політэізме часцей за ўсё багі ўспрымаліся як часткі наяўнага свету, а ў монатэізме адзіны бог з'яўляецца крыніцай і пачаткам існавання наяўнага свету. Даследчык звяртае ўвагу на факт некрытычнага даверу шматлікіх даследчыкаў рэлігійнай гісторыі антычнасці творам хрысціянскіх інтэлектуалаў, якія імкнуліся падкрэсліць вялізную розніцу паміж рэлігійнымі ўяўленнямі ранніх хрысціян і язычнікаў I–III стст. н. э. На яго думку, хрысціянская апалагетычная літаратура адначасова падкрэслівае і зацямняе факт прысутнасці монатэістычных ідэй у філасофскай спадчыне антычнага свету. Антычныя філасофы лічылі, што традыцыйныя багі грэчаскага і рымскага пантэону паходзяць з адзінага пачатку, які ў філасофскіх сістэмах стоікаў і неаплатонікаў валодаў прыкметамі адзінага бога язычніцкага монатэізму. А культ традыцыйных багоў антычныя інтэлектуалы ўспрымалі як асвечаную традыцыяй форму шанавання адзінага пачатку [7], [8].

Дадзеныя думкі выклікалі крытычныя заўвагі іншых даследчыкаў рэлігійнай гісторыі Рымскай імперыі. Амерыканскі гісторык Рамсі Макмален выказваў скептычнае стаўленне да выяўлення «язычніцкага монатэізму» ў духоўнай культуры старажытнарымскага грамадства. Гісто-

рыкі антычнасці значна перабольшваюць тэалагічныя спекуляцыі антычных філосафаў і скажаюць аб'ектыўную карціну рэлігійнага жыцця Рымскай імперыі. Хаця сам даследчык у сваёй працы аб язычніцкай рэлігіі ў Старажытным Рыме выкарыстоўвае тэрмін «салярны монатэізм» у ацэнцы пашырэння ўплыву салярных культаў сярод прадстаўнікоў ваеннай эліты імперыі, але прызнае традыцыйнасць і ўмоўнасць гэтага тэрміну. Для Р. Макмалена рэлігійныя ўяўленні Рымскай імперыі эпохі прынцыпату заставаліся ў рамках традыцыйнага політэізму [9, p. 83–89]. Падобнай пазіцыі прытрымліваецца брытанскі гісторык і адзін з аўтараў Кембрыджскай гісторыі старажытнага свету Гарт Фоўдэн. Для апісання рэлігійнай сітуацыі I–III стст. ён выкарыстоўвае тэрмін позні політэізм, які мусіць падкрэсліць пераемнасць і паступовую трансфармацыю рэлігійных уяўленняў Рымскай імперыі. Монатэістычныя тэндэнцыі, якія прысутнічалі ў інтэлектуальным асяродку, не скажалі політэістычны характар антычнай рэлігіі. Позні політэізм у Рымскай імперыі захоўваў галоўны акцэнт на правільнай рытуальнай практыцы і не валодаў дакладна акрэсленай дагматыкай. Г. Фоўдэн падкрэслівае недактрынальны характар позняга політэізму. Размова аб «язычніцкім монатэізме» можа прывесці да скажонага разумення рэлігійнай гісторыі старажытнага свету [10]. Брытанскі гісторык не згаджаецца з думкай даследчыкаў Мэры Бірд, Джона Норта і Саймона Прайса аб монатэістычнай веры пэўных прыхільнікаў містэрыяльных культаў. Гэтыя даследчыкі ў сваёй калектыўнай працы аб гісторыі рэлігіі старажытнага Рыму выказваюць думку, што рэлігійныя вераванні насельніцтва імперыі знаходзіліся ў прамежкавым стане паміж політэізмам і монатэізмам [11, p. 286–287].

Абмеркаванне праблемы «язычніцкага монатэізму» выявіла супярэчнасць паміж рознымі метадалагічнымі падыходамі да рэлігійнай гісторыі антычнасці. На думку бельгійскага даследчыка Петэра ван Нуфелена, частка даследчыкаў антычнай рэлігіі звяртае значную ўвагу на тэалагічныя спекуляцыі антычных філосафаў, якія існавалі ў вузкіх рамках інтэлектуальнай эліты. Іншыя даследчыкі імкнуцца зменшыць ролю антычнай філасофіі ў рэлігійным жыцці Рымскай імперыі. Яны настойваюць на рытуальным характары антычнай рэлігіі, якая абыходзілася без дакладнай тэалагічнай дактрыны. Супярэчнасць паміж падыходамі заключаецца ў падкрэсліванні ролі рэлігійных ідэй ці рэлігійнай практыкі. Але П. ван Нуфелен адзначае, што дыскусіі вакол канцэпцыі язычніцкага монатэізму выкліканы тым, што гісторыкам антычнасці складана комплексна прааналізаваць відавочную супярэчнасць паміж рэлігійнымі ідэямі і паводзінамі ў рэлігійным жыцці эпохі прынцыпату. Падыход, які імкнецца падкрэсліць значнасць рэлігійных ідэй, звяртаецца да крытычнага разгляду творчай спадчыны антычных інтэлектуалаў. Такога характару даследаванні стаяць на мяжы рэлігійнай гісторыі і гісторыі філасофіі, або інтэлектуальнай філасофіі. Другі падыход звяртаецца да аналізу звестак эпіграфічнага матэрыялу і помнікаў сакральнага мастацтва, звесткі антычных аўтараў выкарыстоўваюцца толькі для спроб рэканструкцыі рэлігійных паводзін. Калі першы падыход значна залежыць ад дасягненняў сучаснай філасофіі, то другі падыход прыўносіць у гістарычныя даследаванні метады і падыходы сацыяльнай і культурнай антрапалогіі. На думку бельгійскага даследчыка, паўстае неабходнасць пераадолець абмежаванасць абодвух падыходаў і выпрацаваць комплексны і кампрамісны погляд на рэлігійную гісторыю Рымскай імперыі [12], [13]. Антычны «філасофскі монатэізм» , згодна з пазіцыяй П. ван Нуфелена, атрымаў рэлігійнае вымярэнне толькі ў першыя стагоддзі існавання імперыі. Першапачаткова антычныя філосафы выказвалі крытыку традыцыйнай рэлігіі старажытных грэкаў і рымлян, імкнуліся рэфармаваць яе згодна са сваімі філасофскімі і этычнымі поглядамі. Эпоха прынцыпату становіцца перыядам звароту антычнай філасофіі да рэлігійнай праблематыкі, калі інтэлектуалы Рымскай імперыі адкрыта дэманструюць прыхільнасць да традыцыйных культаў [13]. Падобную пазіцыю падзяляюць даследчыкі Палімнія Афанасіядзі і Канстанцінас Макрыс, якія лічаць безумоўным рытуальны характар антычнай рэлігіі, але настойваюць на значнасці ролі і ўплыву антычнай філасофіі на рэлігійнае жыццё Рымскай імперыі. Антычная філасофія імкнулася рацыяналізаваць і сістэматызаваць традыцыйную рэлігію, умацаваць антычную рэлігійнасць і набожнасць (εὐσέβεια) [14]. Філасофія дапаўняла антычны політэізм і звяртала ўвагу на праблемы этыкі, псіхалогіі, тэалогіі, метафізікі, сатэралогіі, што прыводзіла да істотнай трансфармацыі рэлігійных ўяўленняў. На думку П. Афанасіядзі, дадзеныя змены ў рэлігійным жыцці прадстаўлены ў гісторыі ўсходніх правінцый Рымскай імперыі [15], [16].

Да праблемы язычніцкага монатэізму звярталіся даследчыкі гісторыі хрысціянскага і язычніцкага гнастыцызму. Ірландскі даследчык гісторыі антычнага платанізму Джон Дылан выказаў меркаванне аб існаванні розных варыяцый монатэізму ў рэлігійнай гісторыі старажытнасці. На яго думку, класічным варыянтам монатэізму традыцыйна лічацца яго «жорсткая» форма ў выглядзе тэалагічнай дактрыны іўдаізму і ісламу. Але ў антычнай гісторыі маглі існаваць «мяккія» формы монатэістычных уяўленняў, якія прысутнічалі ў асяроддзі антычных інтэлектуалаў. Прыкметы «мяккага» монатэізму Дж. Дылан заўважае ў хрысціянскім і язычніцкім гнастыцызме. Тэалагічныя і касмалагічныя сістэмы антычных гностыкаў грунтаваліся на прынцыпе нематэрыяльнага адзінага пачатку, які разгортваецца ў складанай іерархіі багоў і звышнатуральных істот. Прытым даследчык падкрэслівае значны ўплыў уяўленняў антычных гностыкаў на магічныя практыкі, якія прысутнічалі ў штодзённай рэлігійнасці насельніцтва імперыі [17].

Грэчаскі даследчык Ангелас Ханіёціс прызнае наяўнасць монатэістычных тэндэнцый у рэлігійным жыцці эліністычных дзяржаў і Рымскай імперыі, але монатэістычныя ўяўленні існавалі толькі ў асяроддзі антычных інтэлектуалаў. Рэлігійная гісторыя ўсходніх зямель Рымскай імперыі заключаецца ў сацыяльнай і палітычнай канкурэнцыі мясцовых эліт і культавых цэнтраў. Грэчаскі гісторык прапаноўвае выкарыстоўваць тэрмін «мегатэізм» у апісанні рэлігійнай сітуацыі ІІІ ст. да н. э. – ІІІ ст. н. э. Тэрмін мегатэізм адлюстроўвае істотныя змены ў рэлігійных паводзінах насельніцтва эліністычнага і рымскага свету. У эпіграфічным матэрыяле часта сустракаюцца эпітэты багоў «Μέγας θεὸς», «Εἷς θεὸς», якія на думку А. Ханіёціса падкрэслівалі ўнікальнасць і магутнасць бога або багіні для іх прыхільнікаў на ўсходзе Рымскай імперыі. Для грэчаскага гісторыка дадзеныя эпітэты носяць дэманстратыўны характар і сведчаць аб значнай канкурэнцыі паміж разнастайнымі культамі і рэлігійнымі супольнасцямі [18, с. 546–608], [19]. Менавіта гэтая канкурэнцыя ўплывала на мову шанавання традыцыйных багоў і ўказвае на істотную індывідуалізацыю рэлігійнага жыцця ўсходніх правінцый. У падобным ключы разважае галандскі даследчык Хендрык Верснель, які выкарыстоўвае тэрмін «генатэізм» у апісанні рэлігійнай сітуацыі эпохі элінізму і першых стагоддзяў існавання Рымскай імперыі [20, p. 35–37]. Нямецкі гісторык выдзяляе самыя яскравыя рысы антычнага генатэізму: а) касмапалітычныя памкненні, якія былі характэрны для шматлікіх містэрыяльных культаў, асабліва ў кульце Ісіды і Серапіса; б) значная роля цудаў і дзівосных знакаў для рэлігійных уяўленняў; в) прыхільнікі атрымліваюць звышнатуральныя ўзнагароды за вернасць містэрыяльнаму культу; г) наяўнасць эпітэтаў, якія падкрэсліваюць унікальнасць, магутнасць, неперараможнасць, бессмяротнасць бога або багіні; д) шчырая вера і цесная эмацыянальная сувязь паміж вернікам або групай вернікаў з унікальным бажаством [21, p. 289–300]. Але даследчык прызнае, што антычная рэлігія ў эпоху элінізму і прынцыпату захоўвала свой політэістычны характар, але генатэістычныя ўяўленні і практыкі паступова пашыраліся і ўплывалі на рэлігійныя паводзіны жыхароў імперыі. Пашырэнне генатэізму ў рэлігійным жыцці антычнага свету даследчык звязвае з усталяваннем эліністычных манархій і рымскага прынцыпату, якія істотным чынам змянілі палітычную культуру антычнасці [20, p. 72–74].

Грэчаскі даследчык Нікетас Сініясаглу падзяляе інтэлектуальны монатэізм антычных філосафаў і традыцыйныя культы і ўяўленні простых жыхароў імперыі. На яго думку, інтэлектуалы І–ІІІ стст. н. э. заўважалі істотную супярэчнасць паміж філасофскім монатэізмам і традыцыйным політэізмам, распрацоўвалі інклюзіўную ідэалогію агульнаімперскага генатэізму. Такім чынам антычныя інтэлектуалы імкнуліся адаптаваць свае ідэі да народнай рэлігійнасці і афіцыйнага культу рымскіх імператараў. Але інклюзіўнасць агульнаімперскага генатэізму стала прычынай яго ўразлівасці перад крытыкай хрысціянскіх апалагетаў. У цэнтры канфлікту паміж «язычніцкім монатэізмам» антычных інтэлектуалаў і монатэізмам ранніх хрысціян знаходзіліся пытанні рэлігійнай выключнасці і рэлігійнага сінкрэтызму [22]. На думку іспанскага даследчыка Мігеля Эрэра дэ Хаўрэгі праблема язычніцкага монатэізму цесна звязана з гісторыяй рэлігійнага сінкрэтызму антычнага свету. Даследчык вылучае два шляхі фармавання ідэі адзінага бога або адзінага пачатку ў політэістычных сістэмах антычнага свету. Першых шлях – гэта паступовая іерархізацыя традыцыйнага політэістычнага пантэону, у якім багі губляюць сваю самастойнасць і становяцца праявай волі адзінага галоўнага бога. Другі шлях – гэта рэлігійны сінкрэтызм, які прыводзіць да атаясамлення і зліцця

шматлікіх багоў у адно боства [23], [24, p. 179–198]. Праявы язычніцкага монатэізму ў сінкрэтычным кульце Вышэйшага Бога (Ὕψιστος Θεὸς) заўважае брытанскі гісторык антычнасці Стывен Мітчэл. Пашырэнне дадзенага культу даследчык звязвае з ростам цікавасці жыхароў усходу Рымскай імперыі да пытанняў рэлігійнай этыкі і тэалогіі ў II–III стст. н. э. С. Мітчэл адзначае, што дадзены культ імкнуўся адаптаваць да сябе мясцовыя вераванні Малой Азіі, што заўважаецца ў мясцовым эпіграфічным матэрыяле. Мясцовыя багі пераўтвараліся ў пасланнікаў Тэоса Гіпсіста, а сам культ, згодна са сведчаннямі хрысціянскіх аўтараў IV ст. н. э., прытрымліваўся строгіх этычных норм [25], [26]. Пазіцыю брытанскага гісторыка крытыкуе французская даследчыца Ніколь Белайшэ. Яна адстойвае думку аб значнай ролі культу і рэлігійнай практыкі ў духоўнай культуры антычнасці. У цэнтры антычнай рэлігійнасці знаходзілася рытуальная практыка, а не тэалагічныя схемы грэчаскіх і рымскіх інтэлектуалаў. На яе думку, канцэпцыя язычніцкага монатэізму істотным чынам скажае рэальную карціну рэлігійнага жыцця. Асабліва яна крытыкуе пошукі монатэістычных рыс у сінкрэтычным кульце Вышэйшага Бога (Ὕψιστος Θεὸς), бо эпітэт ὕψιστος мог выкарыстоўвацца як эквівалент эпітэтаў μέγας, εἷς [27]. Французская даследчыца згаджаецца з высновамі А. Ханіёціса і Х. Вернселя аб трансфармацыі рэлігійных паводзін у Рымскай імперыі I–III стст. [28].

**Заключэнне.** Абмеркаванне праблемы язычніцкага монатэізму ў сучаснай заходняй гістарыяграфіі дэманструе рознасць метадалагічных падыходаў да даследаванняў рэлігійнай гісторыі антычнага свету. Станоўчае стаўленне да ўжывання тэрміну «язычніцкі монатэізм» выказваюць тыя даследчыкі, якія разглядаюць рэлігійную гісторыю Рымскай імперыі праз прызму гісторыі антычнай філасофіі і літаратуры. Гэтыя даследчыкі ставяць пад пытанне традыцыйнае разуменне тэрміна монатэізм і прапаноўваюць скарэкціраваць яго згодна са сваім падыходам. На іх думку, неабходна надаць значную ўвагу гісторыі рэлігійнай свядомасці антычнага свету і выявіць асаблівасці монатэістычнага дыскурсу ў літаратурнай і філасофскай спадчыне антычных інтэлектуалаў. Крытычнае стаўленне да выкарыстання тэрміну «язычніцкі монатэізм» дэманструюць даследчыкі, якія вывучаюць штодзённую рэлігійнасць насельніцтва Рымскай імперыі, якая прадстаўлена ў эпіграфічным матэрыяле рымскіх правінцый. На іх думку, пытанне язычніцкага монатэізму мае слушнасць толькі ў рамках інтэлектуальнай гісторыі антычнага свету, але рэлігійная практыка антычнай цывілізацыі захоўвала політэістычны характар. Такім чынам, прысутнічае супярэчнасць паміж даследаваннем рэлігійнай гісторыі праз прызму вывучэння рэлігійнай свядомасці ці рэлігійнай практыкі. Прытым абодва метадалагічныя падыходы абсалютызуюць кантраст і рознасць паміж рэлігійнай свядомасцю і практыкай у антычнай культуры, што не дазваляе заўважыць супярэчлівы характар рэлігійнага жыцця Рымскай імперыі I–III стст. Такім чынам перад новымі даследаваннямі рэлігійнай гісторыі антычнага свету паўстае задача пераадолець недахопы гэтых падыходаў і выправіць комплексны і сістэмны погляд на развіццё духоўнай культуры антычнай цывілізацыі.

## Літаратура

1. Ренан, Э. Марк Аврелий и конец античного мира / Э. Ренан ; пер. с француз. Л. Я. Гуревич. – СПб. : Типография М. Меркушева, 1906. – 468 с.

2. Зелинский, Ф. Ф. История античных религий : в 6 т. / Ф. Ф. Зелинский ; пер. с польск. И. Г. Бей. – СПб. : Изд. Квадриум, 2014–2019. – Т. 5, кн. 2. : Религия Римской империи. – 2018. – 560 с.

3. Altheim, F. A history of Roman religion / F. Altheim ; translated by H. Mattingly. – London : Methuen & Co. LTD, 1938 – 558 p.

4. Altheim, F. Deus invictus. Le religioni e la fine del mondo antico / F. Altheim ; traduzione di E. Albrile. – Roma : Edizione Mediterranee, 2007. – 185 p.

5. Halsberghe, G. H. The cult of Sol Invictus / G. H. Halsberge. – Leiden : E. J. Brill, 1972. – 192 p.

6. West, M. L. Toward Monotheism / M. L. West // Pagan Monotheism in Late Antiquity / ed. P. Athanassiadi, M. Frede. – Oxford : Oxford Univer. Press. 1999. – P. 21–40.

7. Frede, M. Monotheism and pagan philosophy in later antiquity / M. Frede // Pagan Monotheism in Late Antiquity / ed. P. Athanassiadi, M. Frede. – Oxford : Oxford Univer. Press. 1999. – P. 41–68.

8. Frede, M. The case for pagan monotheism in Greek and Graeco-Roman antiquity / M. Frede // One God. Pagan monotheism in the Roman Empire / ed. St. Mitchell, P. van Nuffelen. – Cambridge : Cambridge Univer. Press., 2010. – P. 53–81.

9. MacMullen, R. Paganism in the Roman Empire / R. MacMullen. – London, New Haven : Yale Univer. Press, 1981. – 262 p.

10. Фоуден, Г. Поздний политеизм / Г. Фоуден // Кембриджская история древнего мира : в 14 т. ; под ред. А. К. Боумана [и др.]. – М., 2021. – Т. XII, 2 полутом : Кризис империи, 193–337 гг. – С. 711–771.

11. Beard, M. Religion of Rome : in 2 vol. / M. Beard, J. North. – Cambridge : Cambridge Univ. Press., 1996. – Vol. 1 : History. – 474 p.

12. Van Nuffelen, P. Introduction : the debate about pagan monotheism / S. Mitchell, P. van Nuffelen // One God. Pagan monotheism in the Roman Empire / ed. St. Mitchell, P. van Nuffelen. – Cambridge : Cambridge Univer. Press., 2010. – P. 1–15.

13. Van Nuffelen, P. Pagan monotheism as a religious phenomenon / P. van Nuffelen // One God. Pagan monotheism in the Roman Empire / ed. St. Mitchell, P. van Nuffelen. – Cambridge : Cambridge Univer. Press., 2010. – P. 16–33.

14. Athanassiadi, P. La philosophisation du religieux / P. Athanassiadi, C. Macris // Panthée : Religious Transformations in the Graeco-Roman Empire / ed. L. Bricault, C. Bonnet. – Leiden, Boston : Brill, 2013. – P. 41–84.

15. Athanassiadi, P. Introduction / P. Athanassiadi, M. Frede // Pagan Monotheism in Late Antiquity / ed. P. Athanassiadi, M. Frede. – Oxford : Oxford Univer. Press. 1999. – P. 1–20.

16. Athanassiadi, P. The Chaldaean Oracles : Theology and Theurgy / P. Athanassiadi // Pagan Monotheism in Late Antiquity / ed. P. Athanassiadi, M. Frede. – Oxford : Oxford Univer. Press. 1999. – P. 81–148.

17. Dillon, J. Monotheism in the Gnostic Tradition / J. Dillon // Pagan Monotheism in Late Antiquity / ed. P. Athanassiadi, M. Frede. – Oxford : Oxford Univer. Press. 1999. – P. 69–80.

18. Ханиотис, А. Эпоха завоеваний. Греческий мир от Александра до Адриана, 336 г. до н. э. – 138 г. н. э. / А. Ханиотис ; пер. с англ. – М. : Альпина Нон-Фикшн, 2020. – 680 с.

19. Chaniotis, A. Megatheism : the search for the almighty god and the competition of cults / A. Chaniotis // One God. Pagan monotheism in the Roman Empire / ed. St. Mitchell, P. van Nuffelen. – Cambridge : Cambridge Univer. Press., 2010. – P. 112–140.

20. Versnel, H. S. Ter Unus. Isis, Dionysos, Hermes : three studies in henoteism / H. S. Versnel. – Leiden, New York : Brill, 1990. – 268 p.

21. Versnel, H. S. Coping with the Gods. Wayward readings in Greek Theology / H. S. Versnel. – Leiden, Boston : Brill, 2011. – 595 p.

22. Siniossoglou, N. From philosophic monotheism to Imperial Henoteism : esoteric and popular religion in Late Antique platonism / N. Siniossoglou // Monotheism between Pagans and Christians in Late Antiquity / ed. St. Mitchell, P. van Nuffelen. – Leuven : Peeters, 2010. – P. 127–148.

23. Jauregui de M. H. Orphic God(s) : Theogonies and Hymns as venicles of monotheism / M. H. de Jauregui // Monotheism between Pagans and Christians in Late Antiquity / ed. S. Mitchell, P. van Nuffelen. – Leuven : Peeters, 2010. – P. 77–100.

24. Jauregui, de M. H. Orphism and Christianity in Late Antiquity / M. H. de Jauregui. – Berlin, New York : De Gruyter, 2010. – 457 p.

25. Mitchell, S. The cult of theos hypsistos between Pagans, Jews, and Christians / S. Mitchel // Pagan Monotheism in Late Antiquity / ed. P. Athanassiadi, M. Frede. – Oxford : Oxford Univer. Press. 1999. – P. 81–148.

26. Mitchell, S. Further thoughts on the cult of Theos Hypsistos / S. Mitchell // One God. Pagan monotheism in the Roman Empire / ed. St. Mitchell, P. van Nuffelen. – Cambridge : Cambridge Univer. Press., 2010. – P. 167–208.

27. Belayche, N. Deus deum…summorum maximus (Apuleius) : ritual expressions of distinction in the divine world in the imperial period / N. Belayche // One God. Pagan monotheism in the Roman Empire / ed. St. Mitchell, P. van Nuffelen. – Cambridge : Cambridge Univer. Press., 2010. – P. 141–166.

28. Belayche, N. L’évolution des formes rituelles : hymnes et mystèria / N. Belayche // Panthée : Religious Transformations in the Graeco-Roman Empire / ed. L. Bricault, C. Bonnet. – Leiden, Boston : Brill, 2013. – P. 17–40.

Белорусский государственный университет

Поступила в редакцию 13.06.2023